**СУВЯЗІ**

# УРОК З КІТАЙСКІМ КАЛАРЫТАМ

***Наш універсітэт падтрымлівае цесныя кантакты са школамі горада і вобласці. Выкладчыкі і супрацоўнікі наведваюць урокі, выступаюць перад старшакласнікамі падчас прафарыентацыйных мерапрыемстваў, пры неабходнасці аказваюць метадычную дапамогу і дзеляцца сваім вопытам. Гэта дазваляе вучням бліжэй пазнаёміцца з ВДУ імя П.М. Машэрава і ў будучым, магчыма, стаць яго студэнтамі.***





У канцы мінулага года на базе сярэдняй школы №12 г. Віцебска імя Л.М. Філіпенка прайшоў адкрыты ўрок гісторыі для вучняў 5 класа па тэме «Гісторыя і культура Старажытнага Кітая». Госці былі запрошаны з нагоды абароны настаўнікам гісторыі, нашай выпускніцай Марынай Міхайлаўнай Белахвостаўай вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

Падтрымаць маладога педагога прыйшла Таццяна Сяргееўна Дзенісенка, старшы выкладчык кафедры рускай мовы як замежнай ВДУ імя П.М. Машэрава. Яна пазнаёміла вучняў з некаторымі традыцыямі Кітая, паказала асаблівасці чайнай цырымоніі, прадэманстравала кітайскія народныя касцюмы і элементы ўпрыгожвання інтэр'еру ў кітайскім стылі.

«Правядзенне падобных заняткаў павышае цікавасць школьнікаў да прадмета, таму што такі фармат спрыяе максімальнаму пагружэнню ў эпоху, якая вывучаецца. Пры гэтым дзеці не чытаюць сухі тэкст параграфа, а становяцца непасрэднымі ўдзельнікамі ўрока», – адзначыла Таццяна Сяргееўна.

Таццяна Дзенісенка дасканала валодае кітайскай мовай. Яна некалькі гадоў выкладала рускую як замежную ва ўніверсітэце КНР. Выкладчыца добра ведае традыцыі і культуру Кітая.

«Такім чынам, дзеці атрымалі не толькі трывалыя веды па гісторыі Старажытнай Кітайскай дзяржавы, пазнаёміліся з асаблівасцямі развіцця тагачаснага грамадства і яго культурнымі і навуковымі дасягненнямі, але і пагрузіліся ў атмасферу кітайскіх нацыянальных традыцый і асабіста для сябе адкрылі поўную цудаў загадкавую Паднябесную», – расказала Марына Міхайлаўна.

**Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Фота аўтара.**

**ДОБРОТА**

# ПОМОГАТЬ ЛЕГКО И ПРИЯТНО

Студенты нашего университета – добрые друзья Витебского приюта для бездомных животных. Так, в конце прошлого года представители факультета обучения иностранных граждан вместе с Оксаной Анатольевной Сосновской, заместителем декана по воспитательной работе, посетили «Добрик». К слову, ребята часто ездят туда с подарками.

Студенты специальности «Романо-германская филология» сами изъявили желание побывать в учреждении. Они передали питомцам «Добрика» крупы, мясную продукцию, а также вещи, которые будут использованы в качестве подстилок. И, конечно, познакомились с котами и собаками приюта.

«По своей натуре иностранные студенты – очень чуткие и отзывчивые люди. Несмотря на то, что во время обучения их материально обеспечивают родители, они все же находят возможность посетить приюты и детские дома, чтобы помочь нуждающимся. После того, как ребята впервые побывали в «Добрике», они еще долго находились под впечатлением, ведь в Туркменистане приютов для бездомных животных нет», – отметила Оксана Анатольевна.

**Алеся МЯДИЛЬ.**
**Фото из архива ФОИГ.**

